# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 7 снежня 2000 года, чацвер, № 16 (1828)

**А Ў НАС! А Ў ВАС?**

## У эфіры – радыё БДУ

Хутка павінна пачаць работу "Unistar — радыё БДУ". Заснавальнікам гэтай сумеснай радыёстанцыі з'яўляецца Белдзяржуніверсітэт і германская кампанія ARBO media.net. Вяшчальны цэнтр і офіс радыёстанцыі будуць размяшчацца на 7 і 8 паверхах галоўнага корпуса БДУ.

Радыё будзе пераважна музычна-інфармацыйным. 90 % яго эфіру зойме лепшая музыка 80—90-х гадоў, і толькі 10 % — інфармацыйныя выпускі, размовы ды-джэяў і рэклама.

Ужо сёння поўным ходам ідзе фармаванне новага калектыву. Па словах праграмнага дырэктара радыёстанцыі Паула Бараноўскага, абапірацца падчас працы яны будуць толькі на прафесіяналаў. Ды-джэяў і вядучых інфармацыйных выпускаў адбіралі на конкурснай аснове. Штат ужо практычна ўкамплектаваны. Аднак заўсёды знойдзецца месца для сапраўдных талентаў. І стаўка будзе рабіцца не толькі на студэнтаў факультэта журналістыкі, але і на іншых таленавітых маладых людзей.

Так што ўсе, хто неабыякавы да новых ідэй, хто хоча ісці наперад, каму толькі 18 або 35 гадоў, можа шукаць на частаце 99.5 FM "Unistar — радыё БДУ".

*Вольга АНІНА*

**СУСТРЭЧЫ**

## ГАВАРЫЛІ ПА-ФРАНЦУЗСКУ

Па ініцыятыве Савета жанчын адбылася сустрэча студэнтаў секцый французскай мовы факультэта міжнародных адносін нашага універсітэта з намеснікам кіраўніка кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ў Беларусі Мішэлем Рывальe.

Мішэль Рывальe аказаўся не толькі дыпламатам, але і вельмі прыемным, лёгкім у зносінах чалавекам, які адразу змог знайсці агульную мову са студэнтамі. Гаворка атрымалася змястоўнай яшчэ і таму, што ўсе суразмоўцы ведалі французскую мову і маглі свабодна паразумецца. Шмат пытанняў было аб перспектывах супрацоўніцтва факультэта міжнародных адносін з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Францыі. Сустрэчу закончылі з поўнай упэўненасцю, што гэтыя адносіны патрэбна развіваць.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

**АКЦЫІ**

## АД УСЁЙ ДУШЫ

З 14 снежня да 8 студзеня Саюз жанчын БДУ праводзіць каляндную дабрачынную акцыю "Ад усёй душы". Людзі з невялікім дастаткам, якія працуюць у нашым універсітэце, будуць запрошаны ў гэтыя дні на Кастрычніцкую, 4 у студэнцкі гарадок. Менавіта там яны змогуць атрымаць гуманітарную дапамогу. Па словах Алы Уладзіміраўны Мелех, намесніка дырэктара студгарадка па сацыяльных пытаннях, члена Савета жанчын БДУ, гэта хутчэй за ўсё будзе вопратка і харчовыя тавары. Акцыя пачнецца з біялагічнага факультэта. Пазней звярнуцца па гуманітарную дапамогу з'явіцца магчымасць у прадстаўнікоў геаграфічнага факультэта, затым — факультэта журналістыкі і гэтак далей, пакуль не будуць ўзяты пад увагу ўсе падраздзяленні БДУ.

*Вольга АНІНА*

**ЮБІЛЕІ**

## ЗАХАВАЛЬНІКІ ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш" Беларускага дзяржаўнага універсітэта 23 лістапада адзначыў сваё 20-годдзе новай канцэртнай праграмай, прадстаўленай на суд гледачоў у Палацы Рэспублікі.

Калектыў быў утвораны ў верасні 1980 года. З таго часу яго нязменным мастацкім кіраўніком з'яўляецца Валянціна Гладкая. За гэтыя 20 гадоў з беларускай культурай дзякуючы ансамблю пазнаёміліся жыхары многіх краін свету: Аўстрыі, Даніі, Егіпта, ЗША, Італіі, Нарвегіі, Сірыі, Тайваня, Францыі... Сёлета на Сусветнай фалькларыядзе ў Токіё "Неруш" здзівіў японцаў сваёй творчасцю і выдатнымі касцюмамі, створанымі мастаком Наталляй Мядзведскай.

Увесь час свайго існавання "Неруш" займаецца вывучэннем народнай творчасці: ездзіць у фальклорныя экспедыцыі па розных рэгіёнах краіны, збірае і запісвае песні, музыку і танцы. За пастаноўку канцэртнай праграмы "Калядныя гульні", якая мела арыгінальную тэатралізаваную інсцэніроўку старажытнага беларускага свята, ансамблю было ў свой час нададзена званне народнага.

За вялікі ўклад у прапаганду беларускай культуры за мяжой летась калектыў быў адзначаны прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Навінкай сезону стала спалучэнне фальклорных матываў і сучасных музычных рытмаў. Асабліва трэба адзначыць працу па ўзбагачэнні рэпертуару, якую праводзіць музычны кіраўнік калектыву Іосіф Рэут.

На святкаванні юбілею ансамбль быў адзначаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і захаванне духоўнай спадчыны, а таксама пуцёўкай у Перу на міжнародны фестываль універсітэцкіх калектываў.

*Па матэрыялах прэс-службы БДУ*

**ПОСТФАКТУМ**

## ЖУРНАЛІСТЫКА НА НАВУКОВАЙ АСНОВЕ

21 лістапада факультэт журналістыкі БДУ сумесна з Беларускім саюзам журналістаў пры падтрымцы Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы наладзіў міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Журналістыка — 2000". Мерапрыемства праходзіла ў Рэспубліканскім доме журналіста. У канферэнцыі ўдзельнічалі выкладчыкі і журналісты не толькі з Беларусі, але і з Расійскага універсітэта дружбы народаў, Мардоўскага, Уральскага, Варонежскага і Стаўрапольскага дзяржаўных універсітэтаў.

Падчас працы канферэнцыі былі абмеркаваны тэндэнцыі развіцця сучаснай журналістыкі, мова і стыль СМІ, заканамернасці развіцця сусветнай журналістыкі, праблемы сучаснай камунікацыі, гісторыя і наватарства на тэлебачанні і радыё, крытыка ў СМІ і праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці.

*Юлія ПІМЕНАВА,*
*супрацоўнік прэс-службы БДУ*

АБ'ЯВЫ

# РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Загадчыка кафедры** фізікі цвёрдага цела;
**Прафесараў кафедраў:** крыніцазнаўства і музеязнаўства, менеджменту;
**Дацэнтаў кафедраў:** біяфізікі, батанікі, ураўненняў матэматычнай фізікі, беларусазнаўства, гісторыі беларускай мовы, славянскіх літаратур, сацыялогіі журналістыкі, тэхналогій камунікацыі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, крыніцазнаўства і музеязнаўства, экалагічнага і аграрнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, эканамічнай тэорыі;
**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, тэорыі функцый, перыядычнага друку, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі новага і найноўшага часу;
**Выкладчыкаў кафедраў:** сучаснай беларускай мовы, раманагерманскіх моў.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 226-59-39.*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# У прэс-цэнтры кінафестывалю – студэнты журфака

У апошнія восеньскія дзянькі ў Мінску прайшоў VII Міжнародны кінафестываль краін СНД і Балтыі "Лістапад — 2000".

Кінафестываль стаў галоўнай культурнай навіной сталічнага кінатыдня і, вядома, шырока асвятляўся ў рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі. На працягу ўсяго тыдня кіно журналістаў, акрэдытаваных на "Лістападзе — 2000", пра ўсе змены ў праграме, прыезд гасцей і ўдзельнікаў інфармавалі супрацоўнікі прэс-цэнтра. Інфармацыю яны рыхтавалі аператыўна і прафесійна. Сярод тых, хто ўнёс у гэтую працу сваю лепту, былі і студэнты нашага універсітэта.

Трэці год студэнты факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта прыходзяць валанцёрамі ў аргкамітэт кінафестывалю і актыўна працуюць у прэс-цэнтры. Сёлета палову супрацоўнікаў прэс-цэнтра складалі студэнткі журфака з II, III і V курсаў: Іна Аксёнава, Вольга Амяльчук, Таццяна Лашук, Дар'я Буслава, Ала Грыгаровіч, Ірына Каленіна, Вікторыя Ляўкоўская, Вольга Лунчук і Наталля Ярэміч, якая працавала ўпершыню, але прафесійна і з інтарэсам.

*Юлія ПІМЕНАВА,*
*супрацоўнік прэс-службы БДУ*

ІНІЦЫЯТЫВА

# Дапамагчы інвалідам

Ці многія з нас ведаюць, што 3 снежня Міжнародны дзень інваліда? Упэўнены, далёка нямногія. Бо гэты дзень не свята, на якое можна запрасіць сяброў і павесяліцца. Гэты дзень — напамін грамадству пра ягоны абавязак клапаціцца пра тых, каму сапраўды патрэбныя падтрымка і дапамога.

У гэтыя дні спецыялізаваныя арганізацыі і таварыствы праводзяць мерапрыемствы, круглыя сталы, уручаюць падарункі інвалідам. Прафкам студэнтаў універсітэта таксама арганізуе масавую акцыю "Беражы сябе" для студэнтаў-інвалідаў. Але што зробім мы, кожны з нас, для гэтых людзей? Паспачуваем і будзем спакойна жыць далей?

Мы прызвычаіліся жыць у свеце рэчаў, які нам здаецца немагчымым змяніць. Прызвычаіліся да сваіх праблемаў, але ніяк не можам зразумець, што ў іншых яны бываюць больш складанымі і сур'ёзнымі. А тыя, для каго жыццё — гэта вечная барацьба за здароўе, знаходзяцца побач з намі і чакаюць нашай дапамогі. Ці ведаеце вы, колькі людзей гадамі прыкутыя да ложку і гадамі не могуць выехаць за горад, адпачыць, парадавацца сонейку?

Мы можам дапамагчы ім. Матэрыяльна, маральна — не так важна. Як гэта зрабіць? Прыходзьце ў прафсаюзны камітэт студэнтаў: тут вам дадуць адрасы, дзе вашую ініцыятыву ацэняць належным чынам.

Калі ж вы не хочаце звязвацца ні з якімі арганізацыямі, можаце проста дапамагчы бабулі несці сумкі, дзядулі — перайсці вуліцу ці ўзняцца па лесвіцы, інваліду — даць грошы, калі адчуваеце, што яны яму дапамогуць. Галоўнае — не адварочвайцеся ад інвалідаў, бо на іх месцы ў кожны момант можа апынуцца хто-небудзь з нас.

*Віталь МІЧКОЎ,*
*старшыня сацыяльнай камісіі прафсаюзнага камітэта студэнтаў БДУ*

СУСТРЭЧЫ

# АБ ІНТЫМНЫМ З ДАКТАРАМІ

Працягвае работу клуб "Студэнцкая сям'я — XXI стагоддзе", які дзейнічае пры падтрымцы Саюза жанчын і міжнароднай грамадскай арганізацыі "Надзея-экспрэс". У канцы лістапада на пасяджэнне клуба ў інтэрнат № 2 наведалася ўрач-гінеколаг 2-га раддома Мінска Надзея Крапко. Гэта быў вечар пытанняў і адказаў.

Па словах Вольгі Леанідаўны Жук, якая з'яўляецца аўтарам і дырэктарам праекта, 12 снежня ў інтэрнаце № 6 будзе наладжана і сустрэча для мужчын з урачом-андролагам. Бліжэй да калядных святаў пройдуць лекцыі для маладых цяжарных маці, падчас якіх будуць закранацца тэмы родаў без страху, здаровага дзіцяці і г. д.

*Вольга АНІНА*

КОМПАС ПЕРШАКУРСНІКА

# ПРАФЕСІЙНА, АНАНІМНА, БЯСПЛАТНА

З 1 снежня пачаў працаваць дыягнастычны цэнтр псіхалагічнай службы БДУ. Як і ўся служба, цэнтр працуе пад дэвізам "Прафесійна, ананімна, бясплатна".

Многім хацелася б навучыцца разумець сябе, навакольных людзей і тыя сітуацыі, у якія даводзіцца трапляць. Асабліва гэта адчуваецца ў студэнцкія гады, калі так хочацца атрымаць болей ведаў.

У цэнтры можна прайсці псіхадыягностыку пры дапамозе камп'ютэрных тэстаў і бланкавых методык, пракансультавацца з псіхолагам, паспрабаваць скласці псіхалагічны партрэт асобы. У той жа час адным з асноўных накірункаў дзейнасці практычнага псіхолага з'яўляецца дыягностыка псіхічнага стану і якасцяў асобы.

Цэнтр прапануе наведнікам наступныя паслугі:

— дыягностыка стану: самапачуванне, настрой, схільнасць да стрэсаў і дэпрэсіі;

— дыягностыка базавых уласцівасцяў асобы: тып тэмпераменту, індывідуальна-тыпалагічныя ўласцівасці;

— дыягностыка індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцяў: характаралагічных, дзейнасных, акцэптуцыі;

— дыягностыка інтэлекту: каэфіцыент інтэлекту (IQ), эрудыцыя, інтэлектуальныя патрэбы, структура інтэлекту;

— дыягностыка самапазнання: матывацыя, каштоўнасныя арыентацыі, самаацэнка, накіраванасць, адаптаванасць;

— дыягностыка рэгулятыўна-валявых кампанентаў: валявы самакантроль, мэтанакіраванасць, імкненне да дасягнення выніку;

— дыягностыка міжасабовых адносінаў, адносінаў паміж людзьмі, канфліктаў, структуры адносінаў;

— прафарыентацыйная дыягностыка: інтарэсы, схільнасці, перавагі прафесійнага выбару;

— дыягностыка ўнутрысямейных адносінаў: адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, задаволенасць шлюбам, канфлікты ў сям'і.

Дыягнастычны цэнтр вы лёгка знойдзеце па адрасе: вул. Кастрычніцкая, д. 2, пакой 102, тэл. 227-57-74. Вас чакаюць тут з 16.00 да 18.00 (апрача суботы і нядзелі).

*Т.В. НАВУМЧЫК,*
*педагог-псіхолаг*

# ДЗЮДАІСТЫ НЕ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ МЕДАЛЁЎ

У лістападзе ў спартыўным комплексе "Уручча" прайшло першынство ВНУ па дзюдо сярод мужчын і жанчын. У спаборніцтвах прынялі ўдзел прадстаўнікі 22 ВНУ Беларусі — больш за 350 чалавек.

Каманда БДУ ўжо каторы год — у прызёрах. І ў гэты раз наша зборная не засталася без медалёў. Дзяўчаты занялі другое месца, а хлопцы — толькі трэцяе. У параўнанні з мінулым годам (а тады было першае месца) мужчынская зборная выступіла не зусім удала. Верагодна, паўплывала тое, што каманда страціла двух наймацнейшых удзельнікаў — чэмпіёна Еўропы сярод юніёраў Сяргея Ждана (гістфак, І курс), які атрымаў траўму на чэмпіянаце свету, і неаднаразовага чэмпіёна Беларусі Андрэя Паўлючэнку.

У асобных вагавых катэгорыях нашыя студэнты выступілі наступным чынам: Сяргей Шудзікаў (юрфак, ІІІ курс) у вагавай катэгорыі 81 кг заняў другое месца, але ў фінале прайграў чэмпіёну Еўропы Аляксандру Сямёнаву з Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. У вагавай катэгорыі 100 кг трэцяе месца заняў Уладзімір Кораб (ФПМІ, ІV курс), і ў абсалютнай вагавай катэгорыі на пяты-шостым месцы апынуўся Абраз Аліеў (ФМА, V курс), які падзяліў месца з сапернікам.

У жанчын другое месца заняла Алена Шабановіч (юрыдычны каледж) — у катэгорыі звыш 78 кг і ў абсалютнай вагавай катэгорыі — трэцяе. Таксама трэцяе месца, але ў катэгорыі 48 кг заняла Юлія Казакова (ФПМІ, ІІ курс).

Да спаборніцтваў каманду падрыхтаваў старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ Мікалай Браткоў.

*Надзея БАЛДЗІНА*



# КЛІМАТАЛОГІЯ СЁННЯ

З 31 кастрычніка па 3 лістапада на геаграфічным факультэце праходзіла канферэнцыя "Навуковыя і прыкладныя аспекты ацэнкі змянення клімату і выкарыстанне кліматычных рэсурсаў", прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага географа і кліматолага А.Х. Шкляра (1910—1977), а таксама 50-годдзю дзейнасці Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. Канферэнцыя праводзілася Белдзяржуніверсітэтам, Беларускім геаграфічным таварыствам, Інстытутам праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі НАН Беларусі, Дзяржаўным камітэтам па гідраметэаралогіі.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел звыш 110 навукоўцаў — з Беларусі, Расіі, Літвы, Малдовы і ЗША. Сярод іх 15 дактароў навук, прафесараў, больш за 60 кандыдатаў навук з Белдзяржуніверсітэта, Казанскага, Брэсцкага, Вільнюскага і Пермскага універсітэтаў, розных інстытутаў НАН Беларусі і Мінпрыроды, НДІ глебазнаўства і аграхіміі, Дзяржкамгідрамета і іншых арганізацый. Акрамя таго, у канферэнцыі ўдзельнічалі 18 студэнтаў і 6 аспірантаў геаграфічнага факультэта.

З уступным словам на пачатку канферэнцыі выступіў пастаянны прадстаўнік Беларусі ў Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, старшыня Дзяржкамгідрамета Рэспублікі Беларусь Ю.М. Пакумейка.

Падчас працы канферэнцыі на геаграфічным факультэце была арганізавана выстава навуковых прац А.Х. Шкляра, удзельнікі канферэнцыі азнаёміліся з вынікамі даследаванняў навукова-даследчых лабараторый і кафедраў факультэта, наведалі з экскурсіяй Гідраметцэнтр Беларусі, а таксама правялі выязную навуковую сесію на радзіме прафесара А.Х. Шкляра ў Уздзенскім раёне, дзе была адкрыта экспазіцыя ў краязнаўчым музеі, прысвечаная яго жыццю і дзейнасці.



*На пленарным пасяджэнні*

На пленарных і трох секцыйных пасяджэннях было прачытана і абмеркавана больш за 70 дакладаў і паведамленняў, у якіх былі адлюстраваны сучасныя праблемы кліматалогіі, прааналізаваны метады выяўленняў і ацэнкі кліматычных рэсурсаў, іх выкарыстанне ў розных галінах народнай гаспадаркі. Асаблівая ўвага звярталася на вырашэнне гаспадарчых праблем ва ўмовах змянення і хістанняў клімату Беларусі пад уздзеяннем усталяванай тэндэнцыі пацяплення глабальнага клімату, справакаванага антрапагенным уздзеяннем, і прыстасаванне народнай гаспадаркі да функцыянавання ў гэтых умовах. Разглядаліся таксама розныя аспекты агракліматалогіі, сезоннага развіцця прыроды і кліматычнай экалогіі.

У выніку такога падыходу да правядзення канферэнцыі яе ўдалося правесці на высокім арганізацыйна-тэхнічным узроўні, а таксама вылучыць прыярытэтныя накірункі і мерапрыемствы, якія будуць садзейнічаць развіццю кліматалогіі на Беларусі ўжо ў XXI стагоддзі. Сярод мерапрыемстваў, якія неабходна ажыццявіць, удзельнікі канферэнцыі назвалі стварэнне навукова-даследчага Рэспубліканскага цэнтра па клімаце на базе дзейных кліматычных падраздзяленняў. У адпаведнасці з прапановай С.А. Шкляр (дачкі прафесара А.Х. Шкляра) было вырашана зацвердзіць дабрачынную стыпендыю для студэнтаў і аспірантаў геаграфічнага факультэта БДУ па спецыяльнасці "Метэаралогія і кліматалогія".

Падобныя канферэнцыі плануецца праводзіць рэгулярна — раз у пяць гадоў, а наступную, якая пройдзе ў 2005 годзе, — прысвяціць заснавальніку "Метэаралагічнага весніка", стваральніку метэастанцыі "Наднёманне", сусветна вядомаму навукоўцу, прафесару Якубу Наркевічу-Ёдку (1848—1905).

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*адказны за інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*
*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*




*Падчас рэгістрацыі ўдзельнікаў канферэнцыі*



*Даклад на секцыйным пасяджэнні*

# Горад кахання

*Клуб аўтарскай песні БДУ 24 лістапада гэтага года адзначыў свой дзень нараджэння. На святочны канцэрт, які адбыўся з гэтай нагоды 6 снежня ў актавай зале галоўнага корпуса нашага універсітэта, былі запрошаны ўсе студэнты і супрацоўнікі.*

Клуб аўтарскай песні БДУ быў створаны ў 1999 годзе пры дырэкцыі па справах культуры універсітэта. Ідэя яго арганізацыі ўзнікла ў час першага агульнага універсітэцкага конкурсу паэтычнай песні “Фэст-А”. Стала відавочна, што ў БДУ шмат студэнтаў, якія незалежна ад таго, на якім факультэце вучацца, любяць песенную творчасць і з гэтай нагоды хочуць аб'яднацца. Пачынаўся клуб з 15 таленавітых маладых людзей. Сёння іх ужо больш за 30.


Андрэй Івароўскі

Першы канцэрт Клуб аўтарскай песні даў у родным універсітэце. І называўся ён “Пасялі ў сваім сэрцы каханне”. Затым юнакі і дзяўчаты выступілі на гарадской сцэне ў Доме культуры трактарнага завода з праграмай “Мы малюем натхненне”. А 5 красавіка гэтага года яны правялі ў БДУ і другі конкурс паэтычнай песні “Фэст-А 2000”.

Жыццё клуба з першых дзён яго існавання стала насычаным і цікавым. Ён узяў арыенцір на актыўнае самавыяўленне. Моладзь удзельнічала ў многіх фестывалях і конкурсах аўтарскай песні, якія праводзіліся ў рэспубліцы і па-за яе межамі.

Не абышоўся без іх і фестываль “Салігорск”, а таксама VI Міжнародны фестываль “Славуціч — 2000”, наладжаны ў жніўні гэтага года. Маладыя аўтары выступілі і на Брылеўскім полі ў Барысаве ў верасні. Не абмінулі яны і злёт аўтарскай песні ў Раўбічах. Былі запрошаны на фестываль “Лістапад — 2000” у Віцебску. А ў канцы кастрычніка Клуб аўтарскай песні БДУ ўдзельнічаў у 13-м Міжнародным студэнцкім фестывалі “Я і гітара” ў горадзе Роўна на Украіне.

Арганізацыя ўласных канцэртаў, удзел у іншых фестывалях аўтарскай песні папоўнілі клуб новымі творчымі сіламі. Сёння сюды прыходзяць не толькі студэнты, але і супрацоўнікі, выпускнікі, прадстаўнікі іншых навучальных устаноў.

Сярод іх Віктар Грушнік — цудоўны выканаўца песень, выпускнік біялагічнага факультэта, браты Аляксандр і Уладзімір Яцукевічы — студэнты ФПМІ, Павел Калінкоў — аўтар песень, студэнт юрыдычнага факультэта, паэтка Таццяна Корань, якая вучыцца на хімфаку.


Браты Яцукевічы

Тут варта ўспомніць і аўтара-выканаўцу, выпускніка журфака Алега Дварэцкага, а таксама кампазітара, студэнта ФПМІ Андрэя Івароўскага.

Вельмі ўдалы дуэт сясцёр Вікторыі і Юліі Мінскіх, а таксама дуэт аўтаркі і спявачкі Аляксандры Ляўкевіч і гітарыста Максіма Гроса. Прыемна паслухаць Сяргея Чарнова, аспіранта гістарычнага факультэта.

Кампазітар Сяргей Левановіч стварыў цудоўнае трыо. Добра пачувае сябе на сцэне і Яўген Бархетаў, студэнт педагагічнага універсітэта. Паэткі Надзея Ручанава і Таццяна Дзяшко заўсёды натхнёна чытаюць свае вершы. Ягор Найдовіч з факультэта журналістыкі з'яўляецца аўтарам многіх цікавых песень.

А камандуе ўсім гэтым парадам прэзідэнт клуба Аляксей Нежавец, які з'яўляецца неаднаразовым лаўрэатам і дыпламантам розных конкурсаў і фестываляў. Ён піша вершы і складае для іх музыку, прыгожа спявае. У яго ёсць і добрыя памагатыя — назавем іх кансультантамі клуба: Сяргей Саскавец і Георгій Тучкоўскі. Мара гэтых людзей — зрабіць конкурс аўтарскай песні ў БДУ традыцыйным і штогадовым. А потым давесці яго да ўзроўню рэспубліканскага фестывалю. Таму і збіраюцца хлопцы і дзяўчаты кожны аўторак на хімічным факультэце роўна ў 18 гадзін.

Да дня нараджэння родны універсітэт падарыў ім гітару, чым вельмі ўзрадаваў. Маладым аўтарам і выканаўцам вельмі патрэбна такая ўвага, бо калектыў толькі становіцца на ногі і на-





*Аляксей Нежавец і Сяргей Саскавец*

бірае моцы. І, як паветра, яму неабходна ўласнае памяшканне, дзе можна было б не толькі пакінуць апаратуру, калі тая з'явіцца, але і сабрацца ўсім разам, абмяняцца думкамі, паспяваць за кубкам гарбаты, правесці рэпетыцыю.

Аднак гэтыя людзі не прывыклі наракаць на жыццё. І сёння ад усяго сэрца выказваюць удзячнасць кіраўніцтву БДУ, супрацоўнікам дырэкцыі па справах культуры універсітэта і асабіста дырэктару Уладзіміру Міхайлавічу Макарэвічу за дапамогу і падтрымку.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

**Татьяна КОРЕНЬ**

**ДОЖДЬ**

Какой удивительно теплый дождь,
Как будто об этом его просили.
Другие дожди, вызывая дрожь,
Лили, бежали, шли, моросили.



*Віктар Грушнік*

Молча по крышам
промокшим стуча,
Всем улыбаясь
солнечным светом,
Дождь не грозился
и не кричал —
Дождь провожал
уходящее лето.

**"ЛЕБЕДЮ"**

Я глазам не могла
поверить,
Говорю вам без всяких
шуток:
Белый лебедь сидел,
белый лебедь
На обрывке льда
среди уток.

Я боялась, что мне это
снится —
У меня даже замерло сердце:
Белый лёд и белая птица —
Словно в сказке чудесной, в детстве.

Я тот день вспоминать бы не стала,
Но потом разгулялась вьюга.
Утки сбились в большую стаю,
Чтоб собою согреть и друга.

Я глазам не могла поверить,
Говорю вам без всяких шуток:
Самый в мире красивый лебедь
Выживал среди "глупых" уток.

**Сергей САСКОВЕЦ**

**ГОРОД ЛЮБВИ**

Dm Dm6 E Am
Как много у Любви аллей и скверов —
Dm Dm6 G C
Названья их ушли во мглу былую,
Dm Dm6 E
Но есть он в сердце — сквер Свиданий
Am
Первых
Dm Dm6 E Am
И улица Несмелых Поцелуев.
Dm Dm6 G
Но есть он в сердце — сквер Свиданий
C
Первых
Dm Dm6 E Am
И улица Несмелых Поцелуев.

Есть перекресток Робкого Молчанья
И Тихого Признания Ворота,
Глухой квартал от площади Отчаянья
До тупичка Нечаянной Свободы.

Свой город у Любви. Свои загадки,
Хотя стары они и даже ветхи,
Но вновь на угол наших встреч украдкой
Бреду во сне я, задевая ветки.

Потом на угол Поцелуев Смелых,
Потом на угол Долгих Поцелуев...
И чудится, как арфа ночи белой
Поет, нас к прошлому ревнуя.

***

На форматке окна чертеж,
И не сразу его прочтешь.
Гнутся прутья у чертежа,



*Таццяна Корань*

Веткам хочется мятежа —
Разлетятся на сотни верст
От ствола, что к земле примерз.

**Алексей НЕЖЕВЕЦ**

**УЕЗЖАЮ Я**

Am E Dm
Уезжаю я, и разлучит нас
E Am
Перекресток железных дорог —
Dm Am
Я не знаю, как там получится,
Dm E
На какой расстаемся мы срок.
Gm A7 Dm
Отражается небо синее
G C E
В бесконечно глубоких глазах.
Am Dm
Отчего судьбу не просили мы
E Am
О надёжных на встречу правах?
Dm Am
Отчего судьбу не просили мы
Dm E Am
О надежных на встречу правах?

Поезд ехать пока не решается,
Но расходятся наши пути.
Почему же люди встречаются,
Чтоб потом опять разойтись?
Обниму тебя, и заплачешь ты.
Поднимусь в твой последний вагон.
Разбиваются грёзы и мечты,
И слеза упадет на перрон.

Ветка ивы тихонько шатается
За холодным вагонным окном.
В жизни так всегда получается —
Всё, что было, покажется сном.
Твои волосы растрепалися.
Я уеду, а ветер споет,
Как с тобой на перроне прощались мы,
Как дорог перекрёсток зовет.

Мимолетного счастья нашего
Лишь останется в памяти след.
Не терзай себя и не спрашивай —
Это было, и этого нет.
Уезжаю я, и разлучит нас
Перекресток железных дорог —
Я не знаю, как там получится,
На какой расстаемся мы срок.

# Беларуска-польскія навуковыя стасункі

## Архіўная канферэнцыя

Штогод пашыраюцца навуковыя беларуска-польскія сувязі гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Адным з прыкладаў стала правядзенне 26—27 кастрычніка 2000 года Першай польска-беларускай архіўнай канферэнцыі ў Познаньскім універсітэце. Дзякуючы намаганням прафесара кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі У.М. Міхнюка да ўдзелу былі прыцягнуты архівісты гістарычнага факультэта — Кацярына Смалякова (V курс), якая рыхтуе дыпломную працу на падставе аналізу сістэм архіўнай адукацыі Беларусі і Польшчы, і Настасся Акопава (II курс), а таксама гісторыкі. Праграма канферэнцыі дала магчымасць заслухаць цікавыя даклады: "Станаўленне архіўнай справы ў Беларусі ў 1918 — 1922 гг." (У.М. Міхнюк), "Развіццё архіўнай справы ў Беларусі 1922 — 1929 гг." (Святлана Дубовік, IV курс), "Архівы Беларусі ў 1929 — 1941 гг." (Святлана Тоўсцік, IV курс), "Партыйныя архівы і іх развіццё" (Вольга Капусціна, Аляксандр Марушка, V курс), "Архіўнае будаўніцтва ў БССР у пасляваенны перыяд" (Настасся Акопава), "Сучасная архіўная адукацыя. Польска-беларускія паралелі" (Кацярына Смалякова). Падагульненнем стаў выступ дацэнта К.І. Козака аб сучасным стане і перспектывах архіўнага будаўніцтва на Беларусі, аб паўсядзённасці і памкненнях беларускіх архівістаў.

Польскі бок быў прадстаўлены дакладамі выкладчыкаў кафедры архівазнаўства. Варта адзначыць выступ доктара Томаша Палучынскага "Польская літаратура і архівалії па гісторыі Беларусі ў цэнтральных архівах Польшчы". Прадстаўленыя ім кніжкі пераканаўча сведчылі пра ўвагу польскіх гісторыкаў і архівістаў да беларускіх навуковых праблем. Значнай падзеяй стаў выступ доктара архівістыкі Ірэны Мамчак-Гадкоўскай пра сістэму падрыхтоўкі архівістаў у Познаньскім універсітэце. Гэтую тэму працягнуў былы дырэктар ваяводскага архіва доктар Станіслаў Клыс. Паводле яго вызначэння, польскія маладыя спецыялісты маюць высокі еўрапейскі адукацыйны ўзровень. Скіраванасць на найноўшыя тэхналогіі ў сучасных польскіх інфармацыйных архіўных сістэмах прадэманстраваў доктар Рафал Галуба.

Знаёмства з дзяржаўным архівам у Познані падчас другога дня працы паказала практычную значнасць супольнай працы польскіх архівістаў і гісторыкаў. Пра гэта сведчылі словы, выказаныя дырэктарам архіва Адамам Бенячэўскім, даклады яго намесніка Кшыштафа Стрыйкоўскага (пра сістэму арганізацыі архіваў), магістраў Генрыка Крыстэка (пра навукова-тэхнічную апрацоўку дакументаў і іх выкарыстанне) і Станіслава Вайцахоўскага (пра кансервацыю архіўных дакументаў). Асаблівую цікавасць выклікаў выступ студэнта Себасцьяна Мазуркевіча пра дзейнасць студэнцкага архіўнага таварыства ў Познані.



*Адам Банецкі (крайні справа) разам з выкладчыкамі і студэнтамі-архівістамі 4-га курса; у цэнтры – дырэктар Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў Фернанд Бакур*

Падсумоўваючы зробленае ў час канферэнцыі, акцэнтавалі ўвагу на перспектывах прадстаўнік Дырэкцыі архіваў Польшчы Баляслаў Вашынскі, дэкан гістарычнага факультэта прафесар Тадэвуш Пяткевіч, загадчык кафедры архівазнаўства Познаньскага універсітэта прафесар Станіслаў Сярпоўскі, а таксама прафесар У.М. Міхнюк. Добрым вынікам стала прапанова аб выданні матэрыялаў канферэнцыі, магчымасці абмену студэнтаў і выкладчыкаў. Дзеля гэтага кіраўнікі архіўнага аддзялення і факультэта гатовыя наведаць Мінск, каб практычнымі намаганнямі ўзмацніць навуковае супрацоўніцтва бакоў.

Між іншым, не менш значнай была культурная праграма наведвання гістарычных здабыткаў горада, гістарычнай бібліятэкі Акадэміі навук Польшчы ў Курніках, дзе старанна захоўваецца немалая дакументальная частка нашай супольнай спадчыны з часоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Напярэдадні правядзення міжнароднага семінару "Беларусь і Тадэвуш Касцюшка" арыгінальныя дакументы аб Касцюшку выклікалі значную цікавасць з боку студэнтаў.

## Кантакты і дыялогі

Амаль адначасова з гэтымі мерапрыемствамі пры выключна добрым стаўленні да польска-беларускіх навуковых адносін з боку дырэктара Вроцлаўскага дзяржаўнага архіва Юзафа Дразда ў Вроцлаве адбылася навуковая сустрэча дацэнта К.І. Козака з польскімі архівістамі.

Пры дапамозе Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку ў кастрычніку прайшла канферэнцыя "Змаганне за беларускую дзяржаўнасць у XX стагоддзі", на якой Белдзяржуніверсітэт прадстаўлялі прафесары У.Ф. Ладысеў, У. Снапкоўскі, дацэнт К.І. Козак.

У пачатку лістапада доктар гісторыі Вроцлаўскага універсітэта Гжэгаж Страўхольд чытаў лекцыі па гісторыі Польшчы для студэнтаў III курса беларускамоўнага аддзялення гістарычнага факультэта БДУ дзякуючы дапамозе Польскага інстытута ў Мінску. Дарэчы, пытанні і адказы з боку Вольгі Шаталавай, Алены Шапанько, Дар'і Зіняевай, Дзімы Віцько пераканалі польскага выкладчыка ў высокіх здольнасцях беларускіх студэнтаў. Практычна такімі ж былі сустрэчы з гісторыкамі-архівістамі II—IV курсаў. Невялікі "круглы стол" з удзелам выкладчыкаў кафедры гісторыі сусветнай і айчыннай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педуніверсітэта толькі ўзняў навуковую значнасць мерапрыемстваў і абазначыў больш шырокі спектр магчымых сумесных навуковых даследаванняў.



*Удзельнікі Першай польска-беларускай архіўнай канферэнцыі ў дзяржаўным архіве ў Познані*

Практычную карысць мела знаходжанне на аддзяленні архівазнаўства і музеязнаўства дырэктара Дзяржаўнага архіва ў Любані пана Адама Банецкага, які мае высокую кваліфікацыю, ведае сістэмы архіваў у Германіі, Францыі, Італіі. Яго лекцыі былі зарыентаваны на прафесійную дзейнасць і, магчыма, не мелі вялікай эмацыянальнай насычанасці, але змяшчалі дакладную інфармацыю пра апошнія перамены ў Польшчы. Дэманстрацыя ў Цэнтры інфармацыйных тэхналогій Белдзяржуніверсітэта на аснове падрыхтаванай ім аўтаматызаванай архіўнай праграмы па дакументах Вроцлаўскага універсітэта і яго філіялаў праз Інтэрнэт стала набыткам архівістаў IV курса.

## Міжнародны семінар

Трэба адзначыць, што нямала цікавых сустрэч адбылося непасрэдна на гістарычным факультэце. Так, з 28 па 29 лістапада 2000 года з дапамогай Польскага інстытута пры ўдзеле Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў (Францыя) адбыўся міжнародны семінар "Беларусь і Тадэвуш Касцюшка: спадчына, час і здабыткі". Адкрыццё семінару ўрачыста віталі прарэктар Белдзяржуніверсітэта А.А. Яноўскі, дэкан гістарычнага факультэта С.М. Ходзін, дырэктар Польскага інстытута Цэзарый Карпінскі. Падчас навуковага абмеркавання разглядаліся наступныя пытанні: агляд беларуска-польскіх архіўных крыніц (А.К. Галубовіч); Тадэвуш Касцюшка як фартыфікатар (Ян Бергер — кіраўнік архіва Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Польшчы) і картограф падчас яго знаходжання ў ЗША (Л.Р. Казлоў). Былі адзначаны гістарычныя паралелі падзей Французскай рэвалюцыі і паўстання 1794 года (Г. Іксанава), а таксама роля Т. Касцюшкі ў напалеонаўскіх войнах 1806—1815 гг. (А.У. Ерашэвіч), знешнепалітычныя фактары польскіх адносін на пачатку 20 ст. (дырэктар Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў Фернанд Бакур, А.М. Лукашэвіч).

Значнае месца на семінары занялі пытанні паўстання 1794 года: роўнасці ВКЛ (Я.К. Анішчанка), ваеннага майстэрства Тадэвуша Касцюшкі (В.П. Талмачоў), бітвы пад Мацяёвіцамі (П.А. Мацюш), стану

войскаў ВКЛ (І.В. Мельнікаў). Асобна разглядаліся пытанні як пра ўдзел у выступленнях егераўстральцоў ВКЛ (Ю. Грыбоўскі), так і пра Міхаіла Сакальніцкага, Тадэвуша Тышкевіча і інш. (А.А. Яноўскі, В.В. Гарбачова), пра канфіскацыю шляхецкіх маёнткаў (У.А. Сосна).

Удзельнікі семінару пачулі характарыстыку часу, у якім жыў Тадэвуш Касцюшка (У.П. Емяльянчык), даведаліся пра навацыі палітычнага і прававога мыслення чалавека той эпохі (Я.А. Юхо, Алена Лабузава, Юлія Доўнар, Т.Г. Кейта-Станкевіч). Цікавае паведамленне пра асобныя бакі жыцця Тадэвуша Касцюшкі падрыхтавала Вольга Коваль (пра каханне да Л. Любамірскай), не менш змястоўнымі былі паведамленні пра яго вобраз у друку (П.А. Лойка, Ірына Каштелян), аналіз месца славутага сына Беларусі Тадэвуша Касцюшкі ў яе гісторыі (К.І. Козак, доктар Варшаўскага універсітэта Ян Махоўскі), а таксама роля яго паслядоўнікаў — Кастуся Каліноўскага і інш. (А.Л. Петрашкевіч). Культуралагічныя асновы мемарыялізацыі сядзібы — месца нараджэння героя — галоўная тэма навукова-практычнага паведамлення А.А. Гужалоўскага.

Дзякуючы намаганням бакоў была арганізавана паездка на радзіму Тадэвуша Касцюшкі ў Мерачоўшчыну. Там з вялікай цікавасцю на месцы былой сядзібы Касцюшкаў студэнтамі І курса былі праслуханыя выступленні зямлячак героя — студэнткі Таццяны Бакавец і супрацоўніцы лабараторыі інфарматыкі гістарычнага факультэта Алены Басалай. Знаёмства з Косаўскім палацам, мясцовымі царквой і Траецкім касцёлам яшчэ раз пераканалі прысутных у наяўнасці цудоўных гістарычных збудаванняў і іх недастатковай папулярызацыі ў Беларусі.

Яшчэ адзін цікавы момант семінару — арганізацыя выставы "Славутыя постаці Беларусі" на аснове найноўшых архіўных дакументаў Беларусі і Польшчы, якія былі прадстаўлены Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі, бібліятэкай у Курніках, а таксама ўзятыя з асабістых збораў У.П. Емельянчыка, А.А. Гужалоўскага, Л.Р. Казлова. Як невялікі музейны праект усё гэта было апрацавана студэнтамі-музеяведамі IV курса Міхаілам Сіманюковым (кіраўнік) разам з Ягорам Бураком, Дар'яй Аляшкевіч і інш. Пры гэтым цудоўна глядзелася і выстава дзіцячых малюнкаў пра Тадэвуша Касцюшку, падрыхтаваных вучнямі сярэдняй школы № 4 г. Мінска, а таксама "Жартоўная Касцюшкіяна", прапанаваная дацэнтам А.А. Гужалоўскім і мастаком Андрэем Леўчыкам. Сістэматызаваны падыход да арганізацыі семінару стаў магчымы дзякуючы ўкладу ў мерапрыемствы прадстаўнікоў розных навуковых і культурных устаноў: А.К. Галубовіч — дырэктара НГАБ, І.В. Яшчэмскай — завуча школы № 4, Н.У. Калымага — загадчыцы фондаў Нацыянальнага музея гісторыі культуры Беларусі, Т.В. Трыч — загадчыцы лабараторыі інфарматыкі гістарычнага факультэта БДУ, Т.І. Качура — выкладчыка французскай мовы, Ірыны Кулік — каардынатара праекта Польскага інстытута і інш.

### Ствараем традыцыі

Па выніках семінару былі выпрацаваны рэкамендацыі пра мерапрыемствы па пашырэнні міжнародных навуковых кантактаў. І гэта ўжо вельмі блізкая перспектыва: хутка аргкамітэт пачне рыхтаваць да друку матэрыялы семінару.

Прафесар універсітэта ў Лодзі Альбін Главацкі разам з вядучымі беларускім гісторыкамі У.Ф. Ладысевым, А.А. Каваленем, У.М. Сідарцовым, У.М. Міхнюком і іншымі рыхтуе на снежань гэтага года «круглы стол» "Лёс заходніх зямель Беларусі. 17 верасня 1939 года". У лютым наступнага года будзе праведзена прэзентацыя кніжкі доктара Беластоцкага універсітэта Яўгена Мірановіча "Найноўшая гісторыя Беларусі", а таксама будзе прачытаны курс лекцый для студэнтаў. Праз кароткі час у Мінску з'явіцца магчымасць сумесна правесці Другую беларуска-польскую архіўную канферэнцыю, студэнты змогуць наведваць курсы лекцый гісторыкаў з Познані, Варшавы, Вроцлава, Любліна, Беластока, Лодзі, а таксама практычныя заняткі з удзелам архівістаў Любані, Познані. Разам з польскімі спецыялістамі будуць падрыхтаваны сумесныя дапаможнік "Асновы архівазнаўства", пераклады на беларускую мову значных польскіх прац і г.д. Вынікам практычнай працы можа стаць правядзенне ў верасні 2001 года семінару "Паланістыка ў дакументах беларускіх архіваў".

Безумоўна, гэты прыклад стаў магчымым дзякуючы намаганням розных устаноў, у тым ліку Польскага інстытута (дырэктар Цэзары Карпінскі), Інстытута гісторыі Вроцлаўскага універсітэта (дырэктар Войцэх Вжэсінскі), Галоўнай дырэкцыі архіваў Польшчы (намеснік дырэктара Уладзіслаў Стэмпняк), архіва ў Вроцлаве (дырэктар Юзаф Дрозд), яго філіяла ў Любані (кіраўнік Адам Банецкі), а таксама кафедры архівістыкі Познаньскага універсітэта (загадчык Станіслаў Сярпоўскі).

Відавочна, што наперадзе нас чакае цікавая і значная навуковая праца. Адзначаючы станоўчыя бакі гэтага навуковага супрацоўніцтва, прарэктар па вучэбнай рабоце А.А. Яноўскі ў шырай размове з польскімі калегамі падчас іх працы ў Белдзяржуніверсітэце зазначыў узаемную карысць менавіта такіх стасункаў.

*К.І. КОЗАК*
*адказны за арганізацыю з беларускага боку, дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта*

# БІБЛІЯТЭКА БДУ ЗАПРАШАЕ

Фундаментальная бібліятэка БДУ запрашае ў снежні наведаць наступныя мерапрыемствы:

| | | |
|---|---|---|
| Без СНІДу ў XXI стагоддзе. Кніжная выстава да Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу | 1 снежня | вул. К Маркса, 31 Абанемент бібліятэкі філалагічнага факультэта |
| Не дапусціць бяды. Кніжная выстава да Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу | 1 снежня | вул. Курчатава, 5 Чытальная зала бібліятэкі радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў |
| Дэкларацыя правоў чалавека. Кніжная выстава, прысвечаная 53-й гадавіне з дня прыняцця Дэкларацыі | 2 снежня | пр-т Ф. Скарыны, 4 Чытальная зала замежнай літаратуры |
| Права быць чалавекам. Кніжная выстава да Міжнароднага дня правоў чалавека | 4 снежня | вул. Акадэмічная, 25 Чытальная зала бібліятэкі факультэта міжнародных адносін |
| Дзень юрыста. Кніжная выстава | 5 снежня | вул. Маскоўская, 17 Чытальная зала бібліятэкі юрыдычнага факультэта |
| Рыцар і слуга Беларусі. Літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння У. Караткевіча | 6 снежня 20.00 | вул. Кастрычніцкая, 10 а, інтэрнат № 7, актавая зала |
| Метады аналізу вод і глеб на ўтрыманне таксічных рэчываў. Кніжная выстава | 11 снежня | вул. Ленінградская, 14 Чытальная зала бібліятэкі хімічнага факультэта |
| Права быць чалавекам. Кніжная выстава да Міжнароднага дня правоў чалавека | 11 снежня | вул. Маскоўская, 17 Чытальная зала бібліятэкі юрыдычнага факультэта |
| Вылічальная тэхніка. Кніжная выстава | 12 снежня | пр-т Ф. Скарыны, 4 Студэнцкая чытальная зала прыродазнаўчых навук № 4 |
| Права быць чалавекам. Кніжная выстава да Міжнароднага дня правоў чалавека | 12 снежня | пр-т Ф. Скарыны, 4 Галоўны корпус, 2-і паверх, навуковая чытальная зала |
| Навуковыя працы Р.Ф. Габасава. Кніжная выстава прац прафесара, доктара фізіка-матэматычных навук | 17 снежня | пр-т Ф. Скарыны, 4 Галоўны корпус, 2-і паверх, навуковая чытальная зала |
| Фармацэўтычны аналіз. Кніжная выстава | 18 снежня | вул. Ленінградская, 14 Чытальная зала бібліятэкі хімічнага факультэта |
| Валютная палітыка. Кніжная выстава | 21 снежня | вул. Акадэмічная, 25 Чытальная зала бібліятэкі факультэта міжнародных адносін |
| Эканоміка для ўсіх. Кніжная выстава | на працягу месяца | вул. Курчатава, 5 Чытальная зала бібліятэкі радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў |
| У дапамогу тым, хто вывучае біяхімію. Кніжная выстава | на працягу месяца | вул. Курчатава, 5 Чытальная зала бібліятэкі радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў |
| Кніга — нятленная памяць і вечнасць. Кніжная выстава | на працягу месяца | пр-т Ф. Скарыны, 4 Галоўны корпус, 2-і паверх, аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі |
| Факсімільныя і рэпрынтныя выданні ў фондах бібліятэкі БДУ. Кніжная выстава | на працягу месяца | пр-т Ф. Скарыны, 4 Галоўны корпус, 2-і паверх, аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі |
| Уводзіны ў эканоміку. Кніжная выстава | на працягу месяца | пр-т Ф. Скарыны, 4 Студэнцкая чытальная зала гуманітарных навук № 3 |

**СЛОВА СТУДЭНТУ**

# МОЛАДЗЬ СУПРАЦЬ СНІДУ

*У нашай рубрыцы "Слова студэнту" мы распачалі размову пра тыя праблемы, якія хвалююць сённяшнюю моладзь. Пра іх пойдзе гаворка і надалей. Не так даўно, 1 снежня, увесь свет адзначаў Дзень барацьбы са СНІДам. Венерычныя хваробы (і СНІД у тым ліку) – тэма чарговага артыкула Віталя Мічкова.*

Выпадковасць, непераборлівасць, непадрыхтаванасць і раннія палавыя сувязі нярэдка прыводзяць да заражэння СНІДам і іншымі венерычнымі хваробамі.

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штогод у свеце рэгіструецца да 50 млн. хворых на пранцы (сіфіліс) і 250 млн. хворых на ганарэю. Зараз у свеце каля 35 млн. ВІЧ-інфіцыраваных чалавек, сярод якіх 30 % складае моладзь.

У Беларусі 2668 чалавек заражаныя вірусам СНІДу. 87,1 % з іх — людзі рэпрадукцыйнага ўзросту; пры гэтым на групу 15—19-гадовых прыпадае 18,6 %, на групу 20—29-гадовых — 68,5 %. І яшчэ крыху статыстыкі: мужчыны складаюць 73 % заражаных, жанчыны — 27 %.

Шляхі заражэння ВІЧ-інфекцыяй могуць быць рознымі, аднак пераважаюць інфіцыраванне праз ін'екцыю заражанымі наркатычнымі сродкамі ці заражанымі шпрыцамі (81,3 %), а таксама палавое інфіцыраванне (17,4 %).

Лячыць гэтыя хваробы складана, а часам нават і немагчыма. Таму для грамадства важна прадухіліць заражэнне імі моладзі. Неабходна падрыхтаваць маладых людзей да сексуальных сувязяў і зрабіць секс бяспечным. І гэтую падрыхтоўку падрастаючага пакалення варта весці з ранніх гадоў, бо (як гэта ні парадаксальна гучыць) сярод моладзі кожны пяты з апытаных у сацыялагічных даследаваннях ведае пра СНІД ад сяброў і знаёмых.

Мне могуць запярэчыць: рэклама "АнтыСНІД" па БТ круціцца настолькі часта, што многіх пачынае ўжо раздражняць. Але варта зважаць і на эфектыўнасць гэтай рэкламы і іншых мерапрыемстваў, што рэалізуюцца ў нашай краіне.

Сацыялагічнае апытанне, праведзенае сярод студэнтаў Мінска, зазначыла, што ў сексуальныя зносіны маладыя людзі ўступаюць у 16-18 гадоў (больш за 48 % апытаных). Пры гэтым 91 % не дапускае для сябе магчымасці заражэння СНІДам ці лічыць яе малаверагоднай — іншымі словамі, ставіцца да хваробы досыць несур'ёзна. Прэзерватыў не з'яўляецца пастаяннай мерай абароны: толькі 9 % апытаных заўсёды выкарыстоўваюць яго пры сувязях з выпадковымі палавымі партнёрамі, і ўсяго 12 % карыстаюцца ім досыць часта. Лекцыі і гутаркі таксама прыносяць мала плёну: праз іх з праблемай заражэння СНІДам і іншымі захворваннямі знаёмяцца толькі 19 % апытаных.

Значыць, усе намаганні пакуль што не даюць выніку. Як можна змяніць гэтую сітуацыю?

Усеагульнае ўцягванне і моладзі, і бацькоў у працэс палавога выхавання. А паколькі сексуальныя сувязі становяцца больш раннімі, то выхаванне павінна адбывацца з як мага ранейшага ўзросту. Маладзёжным арганізацыям неабходна распрацаваць праграмы і мерапрыемствы для арганізацыі асветніцкай дзейнасці па прынцыпе "моладзь — маладым". Якой бы тонкай ні здавалася тэма сексуальных зносін, грамадства мусіць зразумець, што яна даўно ўжо стала набыткам дваровых кампаній хлапчукоў і дзяўчат. Дык чаму ж зараз трэба саромецца даць развіццю гэтай тэмы (а затым — і дзеянням) правільны, бяспечны кірунак?

На маю думку, працаваць трэба па трох асноўных накірунках:

— забеспячэнне моладзі інфармацыяй;

— забеспячэнне індывідуальнымі сродкамі абароны;

— навучанне правілам іх выкарыстання.

Карэктна, але ў зразумелай форме інфармацыя пра СНІД і іншыя захворванні павінна праходзіць праз розныя каналы і крыніцы. Неабходна звярнуцца да наступных формаў:

— забеспячэнне інфармацыяй па згаданай праблеме моладзі ў школах, ПТВ, тэхнікумах, ВНУ ў навучальным працэсе і падчас пазакласнай работы;

— арганізацыя і правядзенне культурна-відовішчных мерапрыемстваў, конкурсаў плакатаў і г.д.;

— падрыхтоўка і правядзенне серый тэлевізійных праграм і радыёперадач, спецвыпускаў, падборак, спецыяльных публікацый у прэсе;

— дэманстрацыя кіна- і відэапрадукцыі, асвятленне мерапрыемстваў Сусветнай кампаніі па прафілактыцы СНІДу;

— рэклама на транспарце (унутры і звонку), а таксама ў іншых месцах збору людзей. Апрача таго, рэклама павінна прысутнічаць на таварах народнага спажывання (майкі, поліэтыленавыя пакеты, запалкі, сшыткі і г.д.) ці ўкладышах да тавараў.

Усе гэтыя мерапрыемствы павінны спрыяць мэце палавога выхавання моладзі. Дамагчыся гэтага складана. Але пачынаць трэба — хаця б з малога: напрыклад, з прэзерватываў. Ці ведаеце вы, што ў свеце штогод выкарыстоўваецца каля 6 млрд. прэзерватываў? Аднак для аховы здароўя неабходна амаль удвая болей — прыблізна 13 млрд.

Прэзерватывы ў Беларусі не робяць, але набыць іх — не праблема. Распродаж можна арганізоўваць у месцах, якія найбольш наведвае моладзь (дыскатэкі, кавярні, бары, крамы і г.д.), пры гарантыі, што прадукцыя будзе высакаякаснай. Бясплатная раздача засцерагальных сродкаў, прымеркаваная, напрыклад, да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам, таксама карысная, але яна не зможа забяспечыць абарону для ўсіх.

Як вы ўжо, верагодна, зразумелі, змагацца са СНІДам і іншымі венерычнымі захворваннямі можна. Трэба толькі навучыць моладзь клапаціцца пра сваё здароўе, а таксама пра здароўе і жыццё свайго партнёра.

*Віталь МІЧКОЎ,*
*студэнт геафака,*
*старшыня сацыяльнай камісіі*
*прафкама студэнтаў БДУ*

**САКРЭТ ФІРМЫ**

# ПІЦЬ ЦІ НЕ ПІЦЬ?

Па звестках новага даклада арганізацый сістэмы ААН, прыкладана 2,4 мільярда чалавек ва ўсім свеце жывуць у непрымальных санітарных умовах.

У дакладзе "Глабальная ацэнка сістэмы водазабеспячэння і санітарных умоваў", падрыхтаваным сумесна Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя і Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ), гаворыцца пра жахлівы кошт, які часам даводзіцца плаціць за кепскія санітарныя ўмовы. Штогод ад захворванняў органаў стрававання гіне 2,2 мільёна чалавек (пераважна дзеці ва ўзросце да 5 гадоў), у той час як падтрыманне неабходнага ўзроўню санітарыі і гігіены дазволіла б скараціць распаўсюджванне гэтых хваробаў на траціну.

Па звестках экспертаў ААН, у краінах, што сталі на шлях развіцця, ачыстка сцёкавых вод праводзіцца нязначнай колькасцю сістэм. У краінах Азіі ачышчаецца толькі 35 % сцёкавых вод, у краінах Лацінскай Амерыкі — 14 %, а ў афрыканскіх краінах ачышчаецца зусім мізэрны працэнт забруджаных вод. Нават у прамыслова развітых краінах ачышчаюцца далёка не ўсе сцёкавыя воды.

Чакаецца, што высновы даклада будуць абмяркоўвацца на сустрэчы 500 экспертаў у галіне водазабеспячэння, якая пройдзе бліжэйшым часам у Бразіліі. Сустрэча ў Бразіліі пройдзе дзеля абмеркавання сусветнай праграмы дзеянняў па забеспячэнні адэкватных санітарных умоваў і водазабеспячэння.

*Па матэрыялах Прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана да друку ў 12.00

7 снежня
Зак. 823у
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша